но политической практики как результата сугубо политических отношений, и, наоборот, раскрыть связь национальных интересов и морали, обычаев, традиций, менталитета.

Разнородность культур во времени и пространстве позволяет понять, почему некоторые типы национальных интересов, соответствующие одним условиям, остановились в развитии в других условиях. В сфере национально-государственной жизни особое значение придается различиям, вытекающим из своеобразия национальных культур и национального характера.

Сущность национальных интересов состоит в установлении, а затем и поддержании общественного согласия. Национальный консенсус, определяющий психологический климат в государстве, приносит пользу всем гражданам государства. Политической, научной и культурной элите он дает возможность почувствовать себя демиургом социально-политических процессов, а народу с оптимизмом смотреть в будущее.

Национальные интересы должны быть прогнозированы и избавлены на длительную перспективу от шараханий от одних идеалов и ценностей к другим. Наряду с тенденциями суверенизации и автономизации социально-политической жизни отдельных народов в мировом сообществе все же превалируют интеграционные процессы. Беларуси именно они дают шанс максимально эффективно использовать выгодное географическое положение, транзитный и культурный потенциал нашей страны.

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

## ЭСТЭТЫЧНАЯ АПЕРЦЭПЦЫЯ Я. Д. ГРЫГАРОВІЧ

Эстэтыку шэраг культуролагаў лічыць тэорыяй мастацкай культуры. Такіх поглядаў прытрымлівалася і Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч, даследуючы пытанні эстэтычных адносін суб'ектаў культуры да рэчаіснасці, іх арыентацыі ў свеце матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Па яе меркаванні, уся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыя эстэтычнай думкі ўяўляе сабой гісторыю рэалізацыі бесперапыннага працэсу спасціжэння аб'ектыўнай ісціны ў галіне эстэтычнага асваення рэальнасці ўвогуле і мастацкага пазнання ў прыватнасці. Таксама, да прыкладу, адзначае пры разглядзе метадалагічных падыходаў да вывучэння культуры філосаф, культуролаг М. І. Крукоўскі: «Той жа лагічны касцяк, што экстрапаліраваны на ўсю культуру, добра паслужыць тут і нам, тым болей, што эстэтыка з'яўляецца нічым іншым, як тэорыяй мастацкай культуры…» [7, с. 10].

Праблемнае поле навуковых інтарэсаў прафесара Я. Д. Грыгаровіч шырокае. Яе цікавілі пытанні фарміравання і развіцця здольнасці чалавека да эстэтычнага ўспрымання і перажывання, ёй глыбока прааналізавана сістэма эстэтычных уздзеянняў, накіраваных на ўзбагачэнне свядомасці і пачуццяў суб'ектаў культуры даступнымі ім эстэтычнымі перажываннямі. Яна даследавала дзейсныя шляхі развіцця эстэтычных поглядаў, густаў і пачуццяў, патрэбнасці, здольнасці будучых спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, якія неабходны для ўдзелу ў стварэнні прыгожага ў мастацтве і жыцці.

Дарам мастацка-вобразнага ўспрымання свету Я. Д. Грыгаровіч была надзелена ад прыроды. Яе эстэтычная свядомасць найперш фарміравалася на роднай глебе – яе малая радзіма, вёска Даманова, што раскінулася ўздоўж ракі Беразіны, стала для будучай даследчыцы вытокам народнай культуры, любові да матчынай мовы, каштоўнасцю стасункаў людзей між сабой і з рэчаіснасцю. Развіццю мастацкага мыслення спрыяла вучоба ў дзіцячай музычнай школе, пазней на літаратурна-музычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, шматлікая канцэртная дзейнасць. Глыбокае разуменне ролі, значэння мастацтва ў жыцці грамадства сфарміравалася канчаткова ў перыяд навучання ў аспірантуры Навукова-даследчага інстытута мастацкага выхавання Акадэміі педагагічных навук СССР. Маскоўская школа эстэтыкі ў той час распрацоўвала такія перспектыўныя паняцці і катэгорыі, як мастацкая ментальнасць, самадастатковасць мастацтва, асэнсоўвала панараму ўсеагульнага мастацкага працэсу ў адзінстве яго ўнутраных рытмаў і гістарычнай цэласнасці. Маладая даследчыца трапіла ў вір навуковых спрэчак, дыскусій, у шэрагу якіх былі пытанні адвольнага абаходжання з эстэтычнымі паняццямі. Менавіта тут Ядвіга Грыгаровіч авалодала новымі падыходамі

і метадамі даследавання мастацкага свету. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі яна вяртаецца на радзіму і займаецца даследаваннем прыроды і сутнасці эстэтычнага выхавання, шляхоў і сродкаў развіцця мастацкага мыслення асобы, удасканалення крэатыўнасці чалавека.

Працы маладой беларускай даследчыцы адрозніваліся глыбінёй эстэтычнага аналізу з’яў і працэсаў мастацкай культуры. Навукоўцу ўсё больш хвалююць праблемы псіхалогіі мастацкага ўспрымання, эмацыянальнага ўздеяння на асобу мастацтвам. Па ініцыятыве Я. Д. Грыгаровіч у Навукова-даследчым інстытуце педагогікі Міністэрства асветы БССР ствараецца лабараторыя эстэтычнага выхавання, дзе яна разам з аднадумцамі распрацоўвае канцэпцыю эстэтычнага развіцця школьнікаў. Сярод распаўсюджаных у педагагічнай навуцы тыпаў накіраванасці вучэбнага працэсу даследчыца лічыць найбольш выніковай эстэтычную. У шматлікіх працах яна даказвае, што ў патрэбнасці чалавека ўспрымаць, спажываць і ствараць прыгожае трэба шукаць вытокі яго дзейнасці. Больш за тое, яна пераконвае, што сродкамі прыгожага магчыма пераадолець шматлікія негатыўныя афекты (страх, агрэсію, зніжэнне рэзістэнтнасці асобы і інш.), спыніць энтрапійныя працэсы ў грамадстве [1]. У адным з інтэрв’ю (карэспандэнту «Літаратуры і мастацтва») Я. Д. Грыгаровіч казала: «Калі мне сумна і душа расшчэплена на дробныя часткі, каб сабраць і гарманізаваць яе, бяру кніжку У. Караткевіча і з асалодай п’ю яго чыстую мову».

Даследчыца імкнулася рэалізаваць палажэнні распрацаванай канцэпцыі: яна пакідае кабінет навукоўцы і ідзе выкладаць псіхолага-педагагічныя дысцыпліны ў Мінскім інстытуце культуры. У яе лекцыйных курсах шмат увагі надаецца пытанням псіхалогіі і педагогікі мастацкай творчасці, мастацкага ўспрымання свету. На створанай і ўзначаленай ёю кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці апрабіруюцца пэўныя тэхналогіі фарміравання эстэтычных інтарэсаў асобы, ажыццяўляецца дыягностыка ўзроўняў эстэтычнай накіраванасці студэнцкай моладзі, выяўляюцца роля і месца культуры ў станаўленні творчай асобы. Спатрэбіліся два дзесяцігоддзі, каб скрупулёзна, навукова абгрунтавана, на высокім тэарэтычным і эмпірычным узроўнях распрацаваць мадэль эстэтыка-выхаваўчага кампанента прафесійнай дзейнасці ў галіне культуры,

вызначыць педагагічныя ўмовы яго фарміравання. Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў фундаментальнай манаграфіі «Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект» [5] і доктарскай дысертацыі. Сведчанне навуковай і практычнай значнасці, навізны гіпатэтычных палажэнняў дысертацыйнай працы Я. Д. Грыгаровіч – прысуджэнне ёй вучонай ступені доктара педагагічных навук адразу па дзвюх спецыяльнасцях («педагогіка сацыякультурнай дзейнасці» і «прафесійная педагогіка»).

Назапашаны вопыт навуковай і практычнай дзейнасці па фарміраванні эстэтычных каштоўнасцей асобы адлюстраваны ў шэрагу публікацый, сярод якіх «Анализ направленности художественных интересов студентов» [2], «Выхаванне прыгажосцю» [1] і інш. Пад эстэтычнай адукацыяй, на думку Я. Д. Грыгаровіч, неабходна разумець не толькі выкладанне пэўных мастацкіх дысцыплін, а сістэматычнае развіццё органаў пачуццяў і творчых здольнасцей асобы студэнта, каб пашырыць магчымасці адчуваць прыгожае і ствараць яго. Гэта задача, па яе меркаванні, павінна вырашацца ў працэсе разнастайных відаў сацыякультурнай дзейнасці. Таму значная колькасць навуковых прац Я. Д. Грыгаровіч прысвечана пытанням тэорыі культуры, псіхолага-педагагічнай сутнасці і спецыфікі сацыякультурнай дзейнасці, зместу, структуры і кірункаў удасканалення культуралагічнай адукацыі і фарміравання сістэмы падрыхтоўкі кадраў культуры: «Сучасны стан і перспектывы развіцця культуралагічнай адукацыі» [3], «Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы» (у суаўтарстве) [4], «Прыкладная культуралогія» (у суаўтарстве) [6].

У шэрагу яе прац прапанаваны структура і дынаміка развіцця эстэтычнай накіраванасці пэўных суб'ектаў культуры (студэнтаў), прааналізаваны элементы і аспекты эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці. Даследчыца ў якасці мэты гэтага віду дзейнасці вылучае адкрыццё для суб'ектаў культуры прыгожых і ўзвышаных бакоў жыцця, прыроды, чалавека, адносін людзей, выяўленне эстэтычных аспектаў рэчаіснасці, цэласнай карціны і гарманічнага свету.

У аснову арганізацыйнай дзейнасці Я. Д. Грыгаровіч як рэктара па будаўніцтве ўніверсітэта культуры і мастацтваў пакладзена адзіная катэгорыя прыгожага. Па яе ініцыятыве ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўніверсітэце распачынаецца падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях, якія садзейнічаюць фарміраванню эстэтычных уяўленняў, мастацкай свядомасці. У структуры спецыяльнасцей і спецыялізацый важнае месца займаюць «кампаратыўнае мастацтвазнаўства», «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «сусветная і айчынная мастацкая культура», «фальклор», «этнафоназнаўства», «народная творчасць», «мастацтва эстрады» і інш. Кіраванне ўніверсітэтам прыпала на перыяд разбурэння старой карціны свету, кардынальнай змены мастацкага бачання. На мяжы стагоддзяў нараджаюцца новыя прынцыпы мастацкага абагульнення і структурыравання рэальнага свету мастакамі, літаратарамі, рэжысёрамі, харэографамі і іншымі дзеячамі мастацтва. Разумеючы непазбежнасць гэтых працэсаў, рэктар адстойвае ідэю актыўнага ўздзеяння мастацтва на чалавека. «Сапраўднае мастацтва, – пісала Я. Д. Грыгаровіч, – здольна гарманізаваць адносіны чалавека са светам, нягледзячы ні на што, незалежна ад якасці гэтага свету». Запэўнівала, што прыгожы, рыхтоўна выкананы твор аказвае актыўнае ўздзеянне на культуру і на чалавечае жыццё, выклікае катарсіс, дазваляе дасягнуць ачышчэння і ўмацавання духу асобы.

Адданасць навуцы аб прыгожым, працавітасць, заклапочанасць лёсам беларускай культуры і яе стваральнікаў былі заўважаны кіраўніцтвам краіны. Ядвігу Дамінікаўну Грыгаровіч прызначаюць намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па сацыяльных пытаннях. На палітычным алімпе раскрыўся яе талент ладзіць дзелавыя стасункі з палітыкамі, дыпламатамі, дзеячамі культуры. Будучы членам каардынацыйнага камітэта жанчын-парламентарыяў Міжнароднага парламенцкага саюза, з трыбуны гэтай старэйшай арганізацыі сусветнай супольнасці Ядвіга Дамінікаўна выступала як прадстаўнік беларускай дзяржавы, нацыянальна-культурных традыцый народа, яго жыццёвых памкненняў. Усё лепшае ўбачанае ў сусветнай адукацыйнай сістэме яна імкнулася ўкараніць у практыку ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Сёння ўніверсітэт мае трывалыя навуковыя, адукацыйныя, мастацка-творчыя сувязі з ВНУ Германіі, Даніі, Польшчы, ЗША, Расіі, Украіны, Кітая, Літвы, Славакіі і іншых краін.

Такі разнастайны, багаты на падзеі жыццёвы шлях… Задаешся пытаннем: «З якіх крыніц Ядвіга Дамінікаўна чэрпала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўную моц, дзе вытокі яе празорлівасці, адчування сутнасці працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным мазаічным свеце?» Адказ я знайшоў у інтэрв'ю Я. Д. Грыгаровіч карэспандэнту газеты «Літаратура і мастацтва». Разважаючы аб духоўнасці чалавека, яна заўважыла: «Пражыць жыццё вельмі складана з чыстай душой. Адзінымі сродкамі падтрымання той чысціні з'яўляюцца мастацтва і вера». Так. Прыгожае мастацтва сапраўды выклікае пачуццё эмацыянальнага пад'ёму, перажывання, эстэтычны імпульс, накіраваныя на творчую дзейнасць.

Неяк Ядвіга Дамінікаўна сказала: «Усё маё жыццё – дарога». Хацелася б дадаць: «Дарога да прыгожага». Няхай дарога, пракладзеная ёй, будзе бясконцай...

---


1. *Грыгаровіч, Я. Д.* Выхаванне прыгажосцю / Я. Д. Грыгаровіч // Маладосць. – 1986. – № 3. – С. 143–149.

2. *Григорович, Я. Д.* Анализ направленности художественных интересов студентов / Я. Д. Григорович // Вопросы теории и практики культурно-просветительной работы : тез. докл. / Мин. ин-т культуры. – Минск, 1991. – С. 13–16.

3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Сучасны стан і перспектывы развіцця культуралагічнай адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч // Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў : матэрыялы навук.-метад. канф. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1998. – С. 3–8.

4. *Грыгаровіч, Я. Д.* Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік, Л. М. Рагачова. – Мінск : БДУКМ, 2001. – 158 с.

5. *Грыгаровіч, Я. Д.* Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект / Я. Д. Грыгаровіч. – Мінск : БДУКМ, 2002. – 403 с.

6. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. для студ. спец. «Культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адук. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с. : іл.

7. *Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ